


1. Музычная праграма
2. Спартыўная пляцоўка
3. Польская кухня
4. Навукова-забаўляльныя майстэрні для дзяцей і дарослых
5. Вулічная выстава «Польская спадчына ў спісе ЮНЕСКА»
6. Дзіцячая пляцоўка
7. Вулічны тэатр
8. Моўна-адукацыйны кірмаш

# ФЭСТ ДЗЕНЬ ПОЛЬШЧЫ Ў МІНСКУ

**5 жніўня 2018 г.,**
Верхні горад, пачатак 13:00







## ① Музычная праграма

Галоўная сцэна, пл. Свабоды
**13:00-17:00; 20:30-23:00**

Выступленне вакальных і танцавальных калектываў польскай дыяспары ў Беларусі, а таксама гасцей з Польшчы. Маладзевы духавы аркестр з ансамблем мажарэтак з Хайнаўкі, надзвычай папулярны сёлета ў Польшчы і за яе межамі **«JAZZ BAND MŁYNARSKI-MASECKI»** і ўнікальная з'ява сусветнай музычнай сцэны, польскае трыа акардэаністаў **«MOTION TRIO»**.

## ② Спартыўная пляцоўка

пл. Свабоды

**РЫНГА** – польскі спорт для кожнага! Майстар-класы па папулярнай ва ўсім свеце польскай спартыўнай гульні, матчы прафесіяналаў і аматараў, спаборніцтвы і конкурсы.

## ③ Польская кухня

Дворык гатэля «Манастырскі», вул. Кірылы і Мяфодзія, 8

Кулінарныя майстар-класы ад шэф-кухара з Польшчы. Прыгатаванне страў па традыцыйных польскіх рэцэптах. Дэгустацыя.

## ④ Навукова-забаўляльныя майстэрні для дзяцей і дарослых

Карэтны дворык, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8
**14:00-18:00**

**Лабараторыя Марыі Складоўскай-Кюры.**
Навуковае шоў, прысвечанае польскай вучонай, прэзентацыя займальных доследаў і эксперыментаў. Кульмінацыя праграмы – здзяйсненне мары кожнага навукоўца – стварэнне вечнага рухавіка!

**Майстар-клас па эка-дызайне. ТКАНІНА.**
Асноўныя прыёмы рамяства з выкарыстаннем ткацкіх матэрыялаў. Выраб унікальных аб'ектаў на мяжы скульптуры і тэкстыльнага мастацтва.

**Навуковая прэзентацыя Лодзінскага ўніверсітэта.**
Знаёмства з магчымасцямі аўтаматызацыі працэсаў паўсядзённага жыцця. Цеплавізійная камера, 3D-прынтэры , робаты. Выкарыстанне мабільных прыкладанняў для дыстанцыйнага кіравання.

**Каляровае падарожжа «Размалюй Польшчу».**
Імправізаваная вандроўка па вялікай карце краіны – цікавыя факты пра гісторыю, геаграфію, прыроду і людзей.







## ⑤ Вулічная выстава «Польская спадчына ў спісе ЮНЕСКА»

Дворык мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага, пл. Свабоды, 15

Прэзентацыя ўнікальных скарбаў гісторыі і прыроды Польшчы, уключаных у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

## ⑥ Дзіцячая пляцоўка

пл. Свабоды

Самых маленькіх гасцей свята прыемна і весела бавіць час запрашае фабрыка цацак «Палессе».

## ⑦ Вулічны тэатр

Карэтны дворык, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8
**19:00-20:00**

Спектакль **«ІМПРЭСАРЫА»** тэатра **«НІКОЛІ»** (Кракаў, Польшча). Напоўненая мастацкімі вобразамі гісторыя таленавітых артыстаў, якія трапілі ў небяспечную пастку сучаснага свету.

## ⑧ Моўна-адукацыйны кірмаш

Арт-тэраса за канцэртнай залай «Верхні горад», вул. Энгельса

Прэзентацыя курсаў польскай мовы і навучальных праграм, моўныя гульні і конкурсы. Магчымасць набыць кнігі польскіх аўтараў у перакладзе на беларускую мову.

Пасольства Рэспублікі Польшча ў Мінску
Польскі Інстытут Мінск
KREUJE

ATLAS Галоўны партнёр
Akademia Sztuk Pięknych im. Władysława Strzemińskiego w Łodzi
UNIVERSITY OF LODZ
Poland tastes good
KOWR National Support Centre for Agriculture
музей экспериментальных наук ЭКСПИРИМЕНТУС ...трогать МОЖНО!
Отель Монастырский
POLESIE